УДК 726.5 (476)

# Вопыт праектавання манастырскага ансамбля (на прыкладзе Свята-Елісавецінскага манастыра ў г.Мінску)

Вараб'ёў В.Г.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

З 90-х гадоў аднаўляецца будаўніцтва манастырскіх ансамбляў. У сувязі з недахопам вопыту праектавання аб'ектаў дадзенага тыпалагічнага раду актуальным з'яўляецца аналіз праблем, разгляд і ацэнка прынятых рашэнняў пры будаўніцтве Свята-Елісавецінскага манастыра (СЕМ).

Манастыр створаны ў 1999 г. і фарміруецца па сённяшні дзень у паўночнай частцы г. Мінска на асноўнай магістралі горада – Даўгінаўскім тракту. Першапачатковае кампазіцыйнае рашэнне манастыра: Свята-Елісавецінская царква (дамінанта) і келейны корпус (фон). Пабудовам характэрны рысы старажытнарускай архітэктуры. З павелічэннем вернікаў у 1999-2004 гг. будуецца храм у гонар абраза Божай Маці «Дзяржаўны» (які становіцца новым кампазіцыйным цэнтрам) і другі келейны корпус. Архітэктар запраектаваных аб'ектаў – М.М. Дзятко.

У 2004 годзе ствараецца архітэктурная майстэрня манастыра, якой праектуюцца: нядзельная школа, дом паломніка, выстаўны комплекс (І этап); дом сястрыцтва, крамы царкоўнага начыння, званіца, гандлёвыя рады (ІІ этап). Уся запланаваная кампазіцыя ўтварае амаль замкнёную перыметральную забудову. Вобразнае рашэнне запраектаваных аб'ектаў мае ў аснове старадаўнюю маскоўскую архітэктуру.

Грунтуючыся на вопыце будаўніцтва СЕМ можна зрабіць шэраг высноў: неабходна выбіраць найбольш прэзентабельныя пляцоўкі (СЕМ размешчаны ў глыбіне забудовы і адсутнічае візуальная сувязь з Даўгінаўскім трактам); прытрымлівацца аднаго стылявага накірунку; развіваць сучасныя падыходы нацыянальнай культавай архітэктуры, якія будуць спрыяць стварэнню непаўторнага архітэктурнага ландшафту краіны.

Літаратура. 1. Свято-Елисаветинский монастырь [Электронный ресурс] / Официальный сайт монастыря. – Минск, 2008. – Режим доступа: http://obitel-minsk.by/neolocation_mid261.html. – Дата доступа: 18.02.2008.